# МІХАІЛ-ІОСІФ ГУЗІКАЎ: БЕЛАРУСКІЯ МЕЛОДЫІ Ў МУЗЫЧНАЙ СТАЛІЦЫ ЕЎРОПЫ

## Музычная і асветніцкая дзейнасць музыканта-вынаходніка са Шклова



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**Мінулым летам мне выпала наведаць некалькі сталіц еўрапейскіх дзяржаў: Браціславу, Вену і Прагу. У Вене ад экскурсавода, які распавядаў пра музычную культуру Аўстрыі, у шэрагу імён кампазітараў і выканаўцаў, чыя творчасць была звязана з гэтай краінай, пачуў відавочна славянскае прозвішча – Гузікаў. На маё пытанне экскурсавод адказаў, што гэты славуты музыкант родам з Расіі і што яго мастацкую творчасць спецыяльна даследаваў венскі музыказнаўца Зыгмунд Шлезінгер.**

**Сапраўды, вядомы венскі музычны крытык апублікаваў у 1836 г. асобную працу, прысвечаную выканальніцкаму майстэрству Міхаіла Гузікава, у якой параўноўваў яго з самім Нікола Паганіні: «Еўропа чула Паганіні, які заваяваў свет гукамі, і да будучых герояў яна ўжо будзе ставіцца больш стрымана, – адзначаў Шлезінгер. – Але вось, каб адбыўся цуд, з'явіўся чалавек, які стварыў, як Арфей, сваю ліру і з пераможнай музыкай крочыць па свеце. Ён заваёўвае галасы знаўцаў мастацтва, масы апладысментамі выказваюць яму сваё захапленне, і чалавек гэты – Гузікаў» [8, с. 12].**

### Сямейная капэла

Аказалася, што радзімай такога славутага ў XIX ст. музыканта быў Шклоў. Пасля турнэ па еўрапейскіх сталіцах я паспрабаваў сабраць і сістэматызаваць сціплыя разрозненыя звесткі аб славутым суайчынніку.

Нарадзіўся Міхаіл-Іосіф Гузікаў у 1806 г. у Шклове ў сям'і прафесійнага флейтыста. Бацька імкнуўся перадаць сваё майстэрства і дзецям. Найбольш здольным сярод дзяцей быў Міхаіл. Дзесяцігадовым хлопчыкам ён ужо дасканала іграў на габоі, кларнеце, флейце і быў гонарам сямейнай капэлы, шырока вядомай у Шклове і яго ваколіцах. Складалася капэла з маці, бацькі і чатырох сыноў. Не ведаючы нот, Міхаіл па памяці бездакорна чыста выконваў мноства народных песень, танцаў, найгрышаў – беларускіх, рускіх, польскіх, украінскіх, яўрэйскіх. Неаднаразова капэла выступала нават у палацы праслаўленага генерал-маёра С. Г. Зорыча. Але неўзабаве юнак захварэў на запаленне лёгкіх, хвароба набыла статус хранічнай. Іграць на духавых інструментах стала цяжка, але жыцця без канцэртнай дзейнасці Міхаіл не ўяўляў. Бацька параіў яму асвоіць новы для сына музычны інструмент – беларускія народныя брусочкі.



Фізічна хворы, Міхаіл не страціў прысутнасці духу і з радасцю прыняў параду бацькі. Брусочкі (праобраз ксілафона) уяўлялі набор спецыяльна падабраных драўляных пласцінак. Гук здабываўся з дапамогай драўляных палачак. Аднак першыя спробы ігры на брусочках прынеслі юнаку і першыя расчараванні. Магчымасці брусочкаў былі даволі абмежаваныя і не адпавядалі здольнасцям, выканальніцкаму ўменню і творчым імкненням шклоўскага віртуоза. І пачаліся пакутлівыя разважанні, настойлівыя пошукі, бясконцыя ператасоўкі драўляных палачак. Зноў і зноў Міхаіл змяняў іх колькасць, даўжыню, парадак размяшчэння. Ён павялічыў на іструменце колькасць брусочкаў да двух з палавінай актаў храматычнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

гукарада, размясціўшы іх у адмысловым парадку. Потым з'явілася ідэя замацаваць брусочкі на трубках з плеценай саломы, што забяспечвала іх свабодную вібрацыю. Вынікі ўдасканалення пераўзышлі ўсе спадзяванні. Незнаёмы з матэматыкай і законамі акустыкі самавук-вынаходнік сканструяваў практычна новы інструмент, які дазваляў узнаўляць вялікую колькасць разнастайных гукаў.



## Гармонік з дрэва і саломы

Міхаіл Гузікаў назваў сваё стварэнне гармонікам з дрэва і саломы. Збіраўся інструмент на вачах у публікі. Славуты Мендэльсон у лісце да сваёй маці пісаў: «З'явіўся малады чалавек з пучкамі саломы і звязкамі палачак. На вачах у гледачоў маэстра хутка выбудаваў іх у выглядзе спараных лесвічак, утварыўшы трапецападобную фігуру. Вось і гатовы музычны інструмент» [6, с. 78–79].

Не менш упарта займаўся юнак і ўдасканаленнем свайго выканальніцкага майстэрства, якое было неабходна для ігры на створаным ім інструменце. За пэўны час Міхаіл Гузікаў дасягнуў значных поспехаў у выкананні складаных музычных твораў на гармоніку з дрэва і саломы. Спачатку сваё майстэрства ён дэманстраваў перад землякамі-сялянамі. Сучаснікі сведчаць, што, пачуўшы гукі гармоніка Гузікава, людзі заканчвалі працаваць і збіраліся на імправізаваныя канцэрты. Прызнанне на радзіме акрыліла юнака, і ён задумаў паспрабаваць сябе ў буйных музычных цэнтрах Расійскай імперыі.

Знаўцы тагачаснага музычнага жыцця раілі Міхаілу адправіцца ў Кіеў, вядомы дасведчанасцю і патрабавальнасцю публікі. Тым больш што ў гэты час там даваў канцэрты славуты польскі скрыпач і дырыжор К. Ліпіньскі. Безумоўна, правінцыяльны шклоўскі музыкант непакоіўся: як дасведчаны кіеўскі глядач успрыме яго незвычайны інструмент, як паставіцца да выканання на ім складаных музычных твораў? Аднак страх гэты быў дарэмны.




Першае ж выступленне Міхаіла Гузікава ўтварыла сапраўдны фурор. Кіяўляне, паводле водгукаў відавочцаў, прынялі шклоўскага віртуоза з энтузіязмам, сустрэлі шквалам авацый. На адным з такіх канцэртаў прысутнічаў і К. Ліпіньскі. У біяграфічным нарысе «Іосіф Гузікаў» Б. Хіджаў прыводзіць фрагмент размовы двух музыкантаў. К. Ліпіньскі звярнуўся да М. Гузікава са словамі: «Сапраўды, Гузікаў, я зачараваны вамі! Вы яшчэ большы мастак, чым я. Я выкарыстоўваў сродкі, якія былі прадстаўлены ў маё распараджэнне. Вы ж стварылі сабе новыя» [5].

## Еўрапейскае прызнанне

Яшчэ больш паспяховымі аказаліся канцэрты шклоўскага віртуоза ў Адэсе, куды ён накіраваўся ў 1832 г. На выступленнях Міхаіла Гузікава прысутнічалі тагачасныя знакамітасці: Ламарцін, Мішо, адмірал Грэй (камендант англійскага флота на Чорным моры), граф М. Варанцоў (тагачасны намеснік у Наварасійскім краі) і інш. Некалькі месяцаў даваў Міхаіл Гузікаў канцэрты ў музычным салоне графа Варанцова. Адмірал Грэй запрасіў нашага суайчынніка выступіць з канцэртамі ў яго рэзідэнцыі ў Нікалаеве і нават прапанаваў выехаць на гастролі ў Лондан, прадракаючы музыканту вялікі поспех.

Адправіцца на гастролі ў Лондан Міхаіл Гузікаў не рызыкнуў з-за хранічнай хваробы лёгкіх. Вырашыў абмежавацца канцэртамі ў Львове, Кракаве, Празе (1833–1835 гг.). Сапраўднай сенсацыяй для патрабавальнай еўрапейскай публікі сталі канцэрты беларускага музыканта ў Вене, якая ў XIX ст. лічылася музычнай сталіцай Еўропы. На працягу дванаццаці вечароў Міхаіл Гузікаў з велізарным поспехам выступаў у перапоўненай зале Тэатра Йозефштадт. Музыкант-вынаходнік быў запрошаны паказаць сваё майстэрства імператарскаму двару.

Паводле слоў відавочцы Д. Фрыдмана, імператар і ўсемагутны князь Метэрніх абсыпалі М. Гузікава сваімі дабротамі і пахваламі, а выканаўцы і кампазітары выказалі нашаму суайчынніку вялікую пашану. Гузікаў зрабіўся сапраўдным кумірам венскай публікі. Усюды прадаваліся яго партрэты, а дамы пачалі насіць локаны «а ля Гузікаў» [2, с. 790]. Акрамя народных мелодый, падчас сваіх канцэртаў музыкант са Шклова заўсёды выконваў творы Ф. Мендэльсона, Ф. Хофмейстара, К. Курпіньскага і іншых праслаўленых тагачасных кампазітараў. Выключны поспех у выкананні Міхаіла Гузікава мелі «Кампанэла» Н. Паганіні і скрыпічны канцэрт Ф. Мендэльсона.

Яшчэ больш умацавала славу геніяльнага музыканта-самавука яго турнэ па шэрагу еўрапейскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краін (Бельгія, Германія, Францыя). Выканальніцкае майстэрства Міхаіла Гузікава было высока ацэнена самымі строгімі еўрапейскімі музыкальнымі крытыкамі. Вось, напрыклад, радкі з артыкула, змешчананга ў 1835 г. у лейпцыгскай «Музычнай газеце-аглядзе»: «Але вось ён пачынае, слабыя неметалічныя гукі нязвыкла раздражнялі слых, людзі здзіўлена і незадаволена пераглядваліся. Яшчэ некалькі хвілін – і раздаюцца гукі здзіўлення, захапляюцца астатнія, усе страшэнна ўзбуджаюцца і больш не могуць стрымліваць сябе. Апладысменты былі бурнымі, зала ўздрыгвала ад крыкаў «Брава!», стукалі нагамі, крычалі; карацей кажучы, тым, чым толькі маглі, выказвалі сваё захапленне» [4].

Без перабольшвання можна сказаць, што Міхаіл Гузікаў зрабіўся сенсацыяй парыжскага музычнага сезона 1836–1837 гг. На яго канцэрце ў Парыжскай камічнай оперы прысутнічалі Ф. Давід, Ф. Ліст, Ф. Мендэльсон, Ф. Шапэн. Аб сваім уражанні ад гэтага канцэрта Ференц Ліст пісаў Жорж Санд: «Я натрапіў на цуд, на знакамітасць з дрэва і саломы, адным словам, на пана Гузікава, які выконвае бясконцае мноства нот у бясконца кароткі прамежак часу і здабывае максімальную колькасць гукаў з двух самых бязгучных цел. Гэта дзіўная перамога над цяжкасцямі, якой цяпер апладзіруе ўвесь Парыж» [1, с. 48–49]. Шчыра ўражаны ігрой віртуоза са Шклова быў і Ф. Мендэльсон: «Гэта сапраўдны феномен – выключны музыкант, які стаіць не ніжэй за любога вялікага віртуоза як па манеры выканання, так і па сваім дасканалым майстэрстве. І таму ён парадаваў мяне сваёй ігрой на гэтым драўляна-саламяным інструменце значна больш, чым многія сваёй ігрой на фартэпіяна, хоць інструмент яго складаны... Як бы там ні было, я ўжо даўно не адчуваў такой асалоды ад канцэрта, таму што Гузікаў сапраўдны геній» [6, с. 78–79].

Незабыўнае ўражанне ад выступленняў Міхаіла Гузікава атрымалі аматары музычнага мастацтва шэрага гарадоў Германіі. Апошні яго канцэрт адбыўся пры перапоўненай зале ў нямецкім горадзе Аахене 21 кастрычніка 1837 года. Відавочца так перадае свае ўражанні ад канцэрта: «На імгненне ў паветры застылі дзве рукі з заціснутымі паміж пальцамі драўлянымі палачкамі-малаточкамі – у залу паліліся першыя нясмелыя гукі, ствараючы дзівосную мелодыю. Яна расла, пашыралася, набываючы новыя таны, і раптоўна палілася магутнай плынню. Здавалася, пальцы музыканта, дакранаючыся да паверхні драўляных палачак, здабывалі з іх фізічна адчувальныя канкрэтныя карціны з жыцця далёкага народа. Калі ж заціхла апошняя нота, у зале застыла цішыня. Потым яе ўзарваў гром апладысментаў і воклічаў: «Брава, маэстра! Біс!..» [3, с. 385].

Але гэтага цудоўны музыкант са Шклова ўжо не пачуў. Свой апошні канцэрт ён даваў ужо безнадзейна хворым. Пераадольваючы нясцерпны боль у грудзях, Міхаіл Гузікаў выйшаў да публікі на паклон, пахіснуўся і ўпаў на сцэну. Бясконцыя канцэрты, пераезды з краіны ў краіну канчаткова падарвалі і так слабое здароўе апантанага творцы. 21 кастрычніка 1837 г. у 35-гадовым узросце, у росквіце свайго цудоўнага таленту Мізаіл Гузікаў пайшоў з жыцця.

176 гадоў мінула з тых падзей. Але час не сцёр з людской памяці імя «шклоўскага Паганіні». Біяграфічныя звесткі аб ім занатаваны ў шэрагу музычных даведнікаў канца XIX – пачатку XX ст. (П. Перепелицин. Музыкальный словарь, М., 1884; Г. Риман. Музыкальный словарь. М., 1901; Э. Энгель. Краткий музыкальный словарь. М., 1907). Некалькі радкоў пра нашага славутага суайчынніка можна адшукаць у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, цэлая старонка прысвечана музычнай творчасці М. Гузікава ў кнізе «Памяць. Шклоўскі раён». Аб стваральніку дзівоснага музычнага інструмента ёсць успамін у манаграфіі І. Д. Назінай «Беларускія народныя інструменты». Некалькі артыкулаў пра беларускага віртуоза апублікаваў у XX ст. часопіс «Советская музыка». Шэраг звестак аб жыцці і творчасці М. Гузікава раскіданы па замежных выданнях.

Спробы сістэматызаваць матэрыялы пра славутага суайчынніка рабіліся і беларускімі навукоўцамі (А. І. Ахвердава, А. Л. Капілаў, І. К. Цішчанка). Але датычылі яны ў асноўным біяграфічных звестак. Цалкам жа творчая спадчына Міхаіла Гузікава патрабуе грунтоўных музыказнаўчых, этнаграфічных даследаванняў манаграфічнага характару. Значэнне яе не толькі ў тым, што шклоўскі віртуоз вынайшаў арыгінальны музычны інструмент і дабіўся дасканалага, высокамастацкага выканання на ім складаных музычных твораў. Заслуга нашага славутага суайчынніка яшчэ і ў тым, што ён адным з першых пазнаёміў заходнееўрапейскую публіку са здабыткамі беларускай музычнай культуры. Шматгранная, самабытная музычная творчасць Міхаіла Гузікава чакае сваіх даследчыкаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Лист, Ф.** Письма бакалавра музыки / Ф. Лист // Советская музыка. – 1936. – № 9.
2. **Фридман, Д.** Михаил-Иосиф Гузиков / Д. Фридман // Рассвет. – 1835.
3. **Хиджев, Б.** Иосиф Гузиков. Биографический очерк / Б. Хиджев // Одесский вестник. – 1844. – № 77.
4. **Ямпольский, И.** Первый виртуоз на ксилофоне / И. Ямпольский // Советская музыка. – 1959. – № 11.
5. **Allgemeine Muzikalische Zeitung**. – 1835. – № 36.
6. **Briefe aus dem Jahren 1831 –1837** von F.Mendelssohn-Bartholdy. –Lpz., 1989. (Письмо от 18 февраля 1836 года).
7. **Sachs, K.** Handbuch der Musikinstruentenkunde / K. Sachs. – Lpz., 1930.
8. **Schlesinger, S.** Guzikow und diesen Holz und Strong Instrument. Ein biographisch artistischer Beitrag zur richtigen Wurdigung ausser ordentlichen Erscheinung / S. Schlesinger. – Wien, 1836. – 37 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ